характер и соответствующих духу времени. А преследование царским правительством сектантов — будь то русские, белорусские или украинские молокане, духоборы или штундисты — лишь подчеркивает их единство, доказывает, что писателю чужда политика государственного устройства, для которого любое самостоятельное проявление мысли является преступлением.

Идея свободолюбия, высокого назначения человека цементирует славянское единство народов, так или иначе — генетически, исторически, творчески — выразившееся в имени деятеля славянской культуры, по разным причинам не пользовавшееся должным вниманием и пониманием у наших современников. И каждый из трех народов — будь то русский, украинский или белорусский — сегодня по праву, закономерно может считать Степняка своим, родным, кровным, общеславянским. При этом, говоря словами самого С.М.Степняка-Кравчинского, "задача исследователя —копать вглубь, пока он не дойдет до гранитной основы, определившей очертания, которыми мы любовались".

**Прэдзеіна А.В.**, *аспірантка,*
*Беларускі універсітэт культуры*

## АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВІЦЕБСКАГА АКРУГОВАГА ТАВАРЫСТВА КРАЯЗНАЎСТВА

Каларыт, разнастайнасць ці, калі магчыма так сказаць, паўнакроўнасць нацыянальнай культуры шмат у чым залежаць ад узроўню развіцця рэгіянальных культур, якія складаюць яе. І, на наш погляд, правамерна сцвярджэнне В.Акудовіча аб тым, што ў культуралагічным сэнсе "Беларусь нельга ўявіць нечым адзіным. Гэта, хутчэй, архіпелаг, дзе ўнутры адзначанай дзяржаўнымі межамі прасторы раскіданы вялікія і зусім дробныя астраўкі беларушчыны". Першародная роля ва ўсебаковым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэнні рэгіёнаў адводзіцца краязнаўчым арганізацыям. Перыяд іх сучаснай дзейнасці можна назваць “адраджэнне краязнаўства”. Гэтаму шмат у чым спрыялі змяненні ў сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў грамадстве, якія значна павысілі цікавасць да краязнаўства. Рух наперад немагчымы без ведаў вопыту папярэднікаў. Вось чаму ўзнікла неабходнасць вывучыць дзейнасць грамадскіх краязнаўчых арганізацый (аршанскай, віцебскай, магілёўскай), якія ў 20-я—пачатку 30-х гг. нашага стагоддзя, у час росквіту краязнаўства, правялі значную працу ў гэтай галіне. Звернем увагу на асветніцкую дзейнасць Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства (ВАТК) як найменш вядомую. Але спачатку спынімся на гісторыі заснавання таварыства.

Яно заснавана ў пачатку 20-х гадоў нашага стагоддзя. Актыўны перыяд дзейнасці таварыства пачаўся пасля прыезду ў Віцебск Мікалая Іванавіча Касяровіча — вядомага беларускага этнографа, мовазнаўцы, літаратуразнаўцы і краязнаўцы. Пад яго кіраўніцтвам краязнаўчая арганізацыя афіцыйна была зарэгістравана ў жніўні 1924 г.: акруговы выканаўчы камітэт зацвердзіў статут краязнаўчай арганізацыі, якая атрымала назву Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства. Статут арганізацыі падпісалі дванаццаць чалавек. Для кіравання працай было выбрана праўленне, першым старшынёю якога быў М.І.Каспяровіч. У яго склад уваходзілі А.Р.Брадоўскі, А.А.Сінкевіч, М.М. Багародзкі і іншыя, а сярод членаў таварыства былі: З.І.Азгур, М.В.Анцаў, З.І.Гарбавец, І.Гаўрыс, В.Х.Абезгаўз, М.Б.Беленькі, М.Б.Вяземскі, З.К.Цярэшчанка, В.С.Угорац, З.М.Апцер, П.Я.Варпаховіч, С.М.Некрашэвіч і інш. У склад ВАТК уваходзілі дванаццаць раённых аддзяленняў і чатыры краязнаўчыя гурткі. Структура таварыства ўключала секцыі: культурна-гістарычную, мастацкую, мовы і побыту, прыродазнаўчую, светазнаўчую, школьна-краязнаўчую, эканамічную, яўрэйскую. На правах секцыі працавалі энтамалагічнае бюро, бібліяграфічная і археалагічная камісіі. Дзейнасць кожнай з іх была накіравана на дасягненне

мэты, якую вызначыла Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства. Мэта прадугледжвала вывучэнне Віцебскай акругі ў гістарычных, эканамічных, этнаграфічных, геалагічных і іншых адносінах, а таксама навуковую распрацоўку пытанняў, якія адносяцца да гэтай вобласці, распаўсюджванне адпаведных ведаў, абуджэнне ўвагі да задач у грамадскім асяроддзі. Для дасягнення гэтай мэты выкарыстоўваліся такія формы, як чытанне лекцый, арганізацыя вечароў, экскурсій, публікацыя артыкулаў і асобных прац, стварэнне бібліятэк па краязнаўстве, якія сябры таварыства адносілі да асветніцкай дзейнасці. Супрацоўнікі ВАТК удзялялі вялікую ўвагу менавіта гэтаму боку працы, бо лічылі, што папулярызацыя яе створыць спрыяльныя ўмовы для развіцця краязнаўства і прыцягне да яго шырокія масы насельніцтва. Краязнаўцы выступалі ў клубах (сярод салдат Чырвонай Арміі) з дакладамі, у якіх стараліся як можна больш у даступнай для слухача форме расказаць аб розных баках жыцця свайго краю. Арганізоўвалі выставы выданняў БССР. Каб больш вядомы былі насельніцтву мясцовыя народныя песні, члены таварыства збіралі іх, а для выканання песень стварылі хор, але, на жаль, ён хутка спыніў сваю дзейнасць. Ішла гаворка і аб неабходнасці выдання лістовак, паштовак з відамі мясцовага краю, яго помнікаў прыроды, старасветчыны.

Вялікае месца ў працы ВАТК займала выдавецкая дзейнасць. У прэсе таго часу пісалі, што толькі чатыры акруговыя краязнаўчыя таварыствы здолелі закласці грунт для сваёй выдавецкай дзейнасці, а раённыя таварыствы яшчэ не набралі моцы для гэтага. Намі знойдзены бібліяграфічны спіс выданняў ВАТК, у якім указана месца выдання працы Л.Аўхімені. Гэта раённы цэнтр Сянно, дзе знаходзілася аддзяленне таварыства. Дадзены факт сведчыць аб тым, што выдавецкай дзейнасцю займаліся і раённыя аддзяленні ВАТК. Аналіз друкаванай прадукцыі таварыства краязнаўства дае падставу меркаваць, што тэмы выданняў разнастайныя: эканоміка, беларуская літаратура, архітэктура, мастацтва, народная творчасць і інш. Сярод выданняў ёсць беларуска-расійскі, краёвы слоўнікі. На

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1927 г. у гэтым таварыстве была самая вялікая колькасць выданняў у параўнанні з працамі Барысаўскага, Магілёўскага, Аршанскага АКТ (на іх ліку было адно-два выданні). Для прац Віцебскага таварыства характэрна і высокая якасць. Аб гэтым сведчыць артыкул А.Шашалевіча, у якім маюцца звесткі аб выданнях ВАТК (у тым ліку і аб першым томе зборніка "Віцебшчына"), спасылкі на рэцэнзіі аб іх. Варта адзначыць артыкул "Выданьні Акруговых Краязнаўчых Таварystваў", у якім змешчаны бібліяграфічныя спісы выданняў АКТ і рэцэнзій на іх. Мы дапоўнілі гэтую бібліяграфічную працу і склалі свой бібліяграфічны спіс надрукаваных прац ВАТК [Гл.: Дадатак].

Выданні Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства ўяўляюць вялікую каштоўнасць для ўсіх, каго цікавіць асаблівасць культурнага развіцця данага рэгіёна. Матэрыял аб цэрквах Віцебска і яго акругі, якія ілюстраваны іх фатаграфіямі, змешчаны ў працы М.Каспяровіча "Беларуская архітэктура" (1925). У кнізе А.В.Багдановіча "Новая беларуская літаратура" даецца аналіз творчасці беларускіх пісьменнікаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Асобую ўвагу аўтар удзяліў тым пісьменнікам і паэтам, працы якіх з'явіліся састаўной часткай "нацыянальнага адраджэння" пачатку XX стагоддзя (Я.Купала, Я.Колас, А.Гарун, Ц.Гартны, Ф.Шантыр, К.Буйло, У.Галубок, М.Багдановіч, А.Паўловіч, З.Бядуля, А.Гурло, Ф.Чарнушэвіч, М.Чарот, аб'яднанне "Маладняк"). Вельмі цікавы пераклад М.Каспяровіча кнігі "Беларускае мастацтва" нямецкага доктара А.Іпэля, які па ініцыятыве вядомага культурнага дзеяча Івана Луцкевіча працаваў па гэтай тэме ў складзе дзесятай нямецкай арміі ў час акупацыі Беларусі. Гэта, па словах перакладчыка, першая праца, якая асвятляе беларускае мастацтва ад яго пачатку з улікам месца развіцця і ўплываў іншых культур. Нягледзячы на недахопы, М.Каспяровіч адзначыў, што гэтая кніга будзе вельмі карыснай як для шырокіх колаў грамадства, так і для даследчыкаў. Неаднаразова М.І.Каспяровіч адзначаў, што для паляпшэння краязнаўчай дзейнасці неабходна ведаць беларускую мову, чаго яшчэ не хапала ў той час "усходне-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай" інтэлігенцыі. З мэтай задавальнення першапачатковай патрэбы ў гэтых ведах ім быў складзены "Беларуска-расійскі слоўнічак". У той жа час М.І.Каспяровіч звяртаў увагу на тое, што ўзбагачэнне літаратурнай беларускай мовы можа ісці толькі шляхам успрыняцця ёю мясцовых слоў. У сувязі з гэтым ім у 1926 годзе была шырока разгорнута праца па ўкладанні слоўніка жывой мовы Віцебшчыны. Вынікам яе з'явіўся ў 1927 годзе "Віцебскі краёвы слоўнік". Інфармацыйная каштоўнасць яго ў тым, што пасля перакладу слова на рускую мову ці тлумачэння яго аўтар дае назву месца, дзе яно ўжываецца. М.І.Каспяровіч склаў да яго яшчэ "Слоўнічак уласных імяньняў". Вядома, што за час друкавання слоўніка ўкладальнікам і яго сябрамі былі апрацаваны дадаткі ў ліку больш дзвюх тысяч слоў, а таксама складзены слоўнічак эратычных назваў (іх было каля тысячы), але невядома, надрукаваны яны ці не. Звестак аб гэтым у нас няма.

Вялікую ролю ў вывучэнні краю М.І.Каспяровіч адводзіў бібліяграфіі. У яго манаграфіі "Краязнаўства" (Мінск, 1929) ёй надаецца вялікая ўвага ў раздзелах "Краязнаўчая бібліографія", "Краязнаўчыя выданьні", дзе аўтар падкрэслівае, што "раней, чым пачаць вывучэньне краю, неабходна ведаць усё тое, што ўжо зроблена ў гэтым стасунку". М.І. Каспяровіч гаворыць тут аб неабходнасці стварэння бібліяграфіі мясцовага краю, раскрывае методыку складання краязнаўчай картатэкі, што з'яўляецца актуальным і ў нашы дні. Акрамя таго, ён узнімаў пытанні складання бібліяграфічнай інфармацыі аб раёне і стварэння калекцыі выразак з газет. Менавіта на гэта была скіравана праца бібліяграфічнай камісіі, якая ўваходзіла ў склад Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства. Яна займалася стварэннем бягучай бібліяграфічнай інфармацыі аб Віцебшчыне, у якой асаблівую ўвагу надавала адлюстраванню артыкулаў з перыядычных выданняў: "Наш край", "Полымя", "Асьвета", "Маладняк", "Узвышша" і інш., вяла работу па падрыхтоўцы зборніка навуковых прац таварыства, складала бібліяграфічны слоўнік аб дзеячах Віцебшчыны, займалася стварэннем бібліяграфічнай інфармацыі па яўрэйскім пытанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значную ўвагу бібліяграфічнай дзейнасці таварыства надаваў М.М.Багародзкі. Ён зазначаў неабходнасць стварэння поўнай бібліяграфіі, уліку праведзенай працы па вывучэнні гарадоў Беларусі і Віцебшчыны, у прыватнасці ён гаварыў, што "будучая праца таварыства павінна заключацца ва ўліку, апісанні і вызначэнні значнасці гістарычных дакументаў".

М.І.Каспяровіч лічыў, што вывучыць творчасць таго ці іншага выхадца з краю і яго ўклад у нацыянальную культуру немагчыма без даследавання "культурнага гнязда", дзе ён нарадзіўся і дзе прайшло яго дзяцінства і станаўленне як асобы. Гэта тычыцца не толькі выдатных дзеячаў краю, але ўсіх, чыя дзейнасць звязана з пэўнай мясцовасцю.

Прыклад працы ў гэтым накірунку зрабіў сам М.І.Каспяровіч, які склаў бібліяграфічны слоўнік у дзвюх частках. Матэрыял кожнага раздзела змешчаны ў алфавітным парадку. Першая частка мае назву "Выяўленчыя мастацтвы, музыка, тэатр". У ёй дванццаць адна персаналія. Другая — "Літаратура, крытыка, даследаваньні мовы"— складаецца з дванццаці персаналій. Кожная з іх суправаджаецца біяграфічнымі звесткамі, бібліяграфічнымі спісамі прац, якія ўжо надрукаваны альбо яшчэ знаходзіліся на той момант у рукапісе, і рэцэнзій на творы ці дзейнасць аўтара.

Члены таварыства справядліва лічылі, што для папулярызацыі дзейнасці сваёй арганізацыі, работ аўтара, аб якім напісана канкрэтная кніга, альбо для пашырэння ведаў аб крыніцах, у якіх таксама можна знайсці інфармацыю аб пэўным прадмеце, неабходна выкарыстоўваць на старонках сваіх выданняў бібліяграфічную інфармацыю, засваенне якой вядзе да пашырэння кругагляду чалавека, павышэння ўзроўню яго інтэлекту. Выданні Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства ўяўляюць вялікую каштоўнасць і як крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі. Асабліва ў гэтым сэнсе трэба адзначыць артыкулы І.П.Фурмана, якія заўсёды суправаджаюцца спісамі выданняў, некаторыя працы А.Шлюбскага, напрыклад "Крашаніна". Апошняя праца змяшчае адчужаную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічную інфармацыю — бібліяграфічны спіс "Выданні Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства", які складаецца з дзевяці бібліяграфічных запісаў.

У зборніку "Віцебшчына", т.І (1925) можна знайсці ўсе формы бібліяграфічнай інфармацыі: асобныя паказальнікі, афінную і латэнтную. На старонках гэтага неперыядычнага выдання змешчаны рэтраспектыўны паказальнік "Бібліографія Віцебшчыны" (матэрыялы), які быў складзены членамі таварыства М.І.Каспяровічам і М.М.Багародзкім. Ён змяшчае 338 бібліяграфічных запісаў на мове выдання — беларускай, рускай, польскай, якія размешчаны ў агульным алфавітным парадку. Бібліяграфічнае апісанне няпоўнае, ахоп матэрыялу не з'яўляецца вычарпальным, аднак гэта была спроба перадаць інфармацыю аб існуючых выданнях, на аснове якой краязнаўцы маглі весці сталую і сістэматычную работу па вывучэнні Віцебшчыны. У зборніку можна знайсці вялікія спісы выкарыстанай літаратуры, напрыклад да артыкула Ф.Лунсгерсгаўзэна "Кароткія праграмы для вывучэньня рэкаў, вазёр і балот мясцовага краю" змешчаны спіс, які складаецца з 28 бібліяграфічных запісаў, размешчаных у хаатычным парадку, асобна выдадзеныя выданні і несамастойныя змешчаны ў агульным радзе, бібліяграфічнае апісанне няпоўнае. Ствараючы такія цікавыя выданні, супрацоўнікі Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства сутыкаліся з вялікімі цяжкасцямі ў сваёй дзейнасці. М.І.Каспяровіч часта звяртаўся ў прафкам з просьбай не перагружаць працай краязнаўцаў; лічыць дзейнасць ВАТК грамадска карыснай, больш увагі ў мясцовай прэсе надаваць публікацыям краязнаўчага характару.

Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства практычна на працягу ўсяго часу было дрэнна матэрыяльна забяспечана, прыбытак ад продажу сваіх надрукаваных прац атрымлівала невялікі, у сувязі з чым члены таварыства імкнуліся выпускаць адзін зборнік у год, а навуковыя працы сваіх калег выдаваць у форме брашур невялікім тыражом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на ўсе гэтыя негатыўныя моманты, выданні ВАТК былі высокай якасці, неслі вялікую навуковую бібліяграфічную інфармацыю, некаторыя друкаваліся на замежных мовах. Так, аб кнізе І.П.Фурмана "Віцебскія мастакі-гравёры" рэцэнзент С.Бар пісаў: "Прыходзіцца дзівіцца, як гэта беднае акруговае таварыства краязнаўства, пры адсутнасьці сродкаў, можа выдаваць такія тэхнічна дасканалыя кніжкі, якія, нам здаецца, наўрад ці здолела б выдаць наша Дзяржаўнае Выдавецтва... Прыходзіцца пашкадаваць, што мала выдадзена (60 экз.)".

Не ўсе планы Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства былі здзейснены, шмат чаго засталося толькі ў накідах.

Пасля прыняцця пастановы прэзідыумам Беларускай акадэміі навук "Аб ліквідацыі Акруговых Таварыстваў Краязнаўства ў сувязі з ліквідацыяй акруг" ад 13 жніўня 1930 г. было створана Віцебскае гарадское бюро краязнаўства, якое спыніла сваю дзейнасць у 1932 г. Як сведчаць архіўныя звесткі, галоўная прычына спынення дзейнасці — палітычныя матывы. Яго кіраўніцтва было абвінавачана ў так званай "нацдэмаўскай дзейнасці". М.І.Каспяровіч быў рэпрэсіраваны.

У нашы дні краязнаўства ў Віцебску не адышло ў нябыт. У горадзе вялікая колькасць краязнаўцаў-аматараў, працуе Віцебскае абласное краязнаўчае аб'яднанне (ВАК). Галоўная "рабочая" мэта ВАКа — абудзіць гістарычную рамантыку ў народзе, асабліва ў маладзёжным асяроддзі, аб'яднаць шматлікіх краязнаўцаў горада. І, на нашу думку, каб захаваць і прадоўжыць вялікія краязнаўчыя традыцыі Віцебшчыны, сучасныя краязнаўцы могуць абагаціць сваю працу каштоўным вопытам асветніцкай дзейнасці ВАТК, нягледзячы на вельмі кароткі перыяд існавання якога, яго сябры ўнеслі неацэнны ўклад у працу па вывучэнні Віцебшчыны і распаўсюджванні краязнаўчых ведаў сярод насельніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Д а д а т а к

1. Аўхімень Л. Эканамічны нарыс БССР.— Віцебск, 1925.— 16 с.

2. Аўхімень Л. Эканамічны нарыс БССР.— Сянно, 1925.— 16 с.

3. Багдановіч А. Новая беларуская літаратура.— Віцебск, 1925.— 25 с.

4. Віцебшчына: Непэрыядычны орган Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства. Т.1.— Віцебск, 1925.— 216, [2] с.: іл.

5. Віцебшчына: Непэрыядычны зборнік Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства. Т.2.— Віцебск, 1928.— 203, [1] с.: іл.

6. Д-р Іпэль. Беларускае мастацтва = D-r A. Ippel. Zur Weiss-Ruthenischen Kunst/Пер. з ням. З.Гарбаўца і М.Касьпяровіча з прадм. перакладчыкаў.— Віцебск, 1925.— 25, [1] с.: іл.

7. Касьпяровіч М.І. Беларуска-расійскі слоўнічак / Прадм. аўтара.— Віцебск, 1925.— 55, [1] с.: іл.— Бібліягр.: 4 назвы.

8. Касьпяровіч М.І. Беларуская архітэктура: Абрыс/Прадм. М. Шчакаціхіна.— Віцебск, 1925.— 52 с.: іл.— Бібліягр.: 10 назваў.

9. Касьпяровіч М.І. Віцебскі краёвы слоўнік: (Матар'ялы) / Інстытут Беларускай Культуры; Камісія для ўкладаньня слоўніка жывой беларускай мовы; Віцебскае Акруговае Таварыства Краязнаўства; Пад рэд. М.Я.Байкова, Б.І.Эпімаха-Шыпілы.— Віцебск: Заря Запада, 1927.— 168 с.

10. Фурман І.П. Віцебск у гравюрах С.Юдовіна / Віцебскае Акруговае Таварыства Краязнаўства; Пад рэд. М.Касьпяровіча; Мастац. рэд. Е.С.Мініна; Прадм. М.Касьпяровіча; Вокл. і ўсе кніж. аздобы С.Б.Юдовіна.— Віцебск, 1926.— 45, [2] с.: іл.— (Мастацтва на Беларусі).— Тэкст бел., ням.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Фурман І.П. Віцебскія мастакі-гравёры [Афармленне Е.С.Мініна].— Віцебск, 1928.— 27, [2] с.: іл.

12. Фурман І.П. Крашаніна: Матар'ялы да гісторыі яе ў Віцебшчыне / Пад рэд. і з прадм. М.І.Касьпяровіча; Мастацкі нагляд і малюнкі ў тэксьце Е.С.Мініна.— 2-е выданьне.— Віцебск, 1925.— 63 с.: іл.— Бібліягр.: 6 назваў

13. Шлюбскі А. Крашаніна (набіванка) / Пад рэд. і з прадм. М.Касьпяровіча.— Віцебск, 1926.— 32 с.: іл.— Бібліягр.: 9 назваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Баранова А.С.,** *доцент,*
*Минский государственный*
*лингвистический университет*
**Ярмолич С.Я.,** *студентка, Белорусский*
*государственный педуниверситет*

## ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ВЗГЛЯДЫ БЕЛОРУССКИХ ПРОСВЕТИТЕЛЕЙ

Грамотность, просвещение, образование на восточнославянских землях расширились благодаря деятельности Кирилла и Мефодия, других религиозных и светских деятелей. Белорусские просветители сделали очень много для распространения книг, грамотности, воспитания любви к книге, образования. Ф.Скорина призывал каждого человека читать, так как книга —"зерцало жития нашего, лекарство душевное, утешение всем опечаленным, наиболее же тем, которые оказываются в бедах и в болезнях". Псалмы, содержащиеся в книгах, "душу и смысл освещают, гнев и ярость усмиряют, мир и покой чинят, тоску и печаль отгоняют, познание... дают, людей в приязнь вводят, ласку и любовь укрепляют..."

Во времена Ф.Скорины главным источником всех познаний была Библия. Просветитель писал: "Библия... порусски переводится: книга... В сей книге всей природы мудрости